# Пасля вайны – новае жыццё на руінах з 1945 г.

Дыскусія
17 мая 2022 г.
19:00-20:30 (беларускі час)

Дыскусія адбудзецца на беларускай і англійскай мовах з сінхронным перакладам.

Гэты круглы стол сабраў трох спецыялістаў па гісторыі Усходняй Еўропы, каб абмеркаваць канец вайны і тое, што адбываецца пасля. Як асобныя людзі і суполкі выжываюць сярод зверстваў генацыду? Як яны спраўляюцца з траўмай, разбурэннем і стратамі? Як яны дамагаюцца правасуддзя? І як аднавіць пасляваенныя грамадствы, якія перажылі гвалт, перадзел межаў і прымусовае перасяленне?

Грунтуючыся на экспертызе па трох краінах рэгіёна – Украіне, Беларусі і Польшчы, – нашы спікеры паспрабуюць адказаць на пытанне, як асэнсаванне Другой сусветнай вайны і яе наступстваў можа дапамагчы нам зразумець бягучую вайну ва Украіне і прадказаць яе вынікі. Пераглядаючы гісторыю 1944 года, тых разбурэнняў, якія вайна і халакост пакінулі ў рэгіёне, нашы госці асветляць, як вынішчаныя прасторы абжываліся наноў, беручы за прыклад спустошаныя штэтлы пасляваеннага польска-беларуска-ўкраінскага памежжа. Акрамя таго, яны звернуцца да пытання, як гісторыя Другой сусветнай вайны застаецца актуальнай ва Украіне і як сённяшні канфлікт уплывае на гістарычныя даследаванні, ствараючы новыя міфы і небяспекі.

**Уступнае слова:**
**Габрыэле Фрайтаг**
Нямецкае таварыства па вывучэнні Усходняй Еўропы

**Мадэрацыя:**
**Магдалена Валігурска**
Універсітэт імя Гумбальдта, Берлін

**Эксперты:**
**Наталля Аляксюн**
Універсітэт Фларыды
**Францыска Экселер**
Кэмбрыджскі ўніверсітэт/Берлінскі свабодны ўніверсітэт
**Ехіэль Вейцман**
Універсітэт імя Бар-Ілана, Ізраіль

**Для ўдзелу ў дыскусіі прайдзіце, калі ласка, рэгістрацыю па спасылцы:** https://us02web.zoom.us/webinar/register/WN_DA-H62HvQGKDk-DzV2t4ow

ФОРУМ ГІСТАРЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСІ
FORUM FÜR HISTORISCHE BELARUS-FORSCHUNG

DGO
Deutsche Gesellschaft für Osteuropakunde e.V.